***Дзяніс Філіпчык***

# АХОВА ЭЛЕМЕНТАЎ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРАЗ ІХ УКЛЮЧЭННЕ Ў ДЗЯРЖАЎНЫ СПІС ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
***(на прыкладзе абраду жыхароў в. Папшычы «Насіць намётку»)***

Вёска Папшычы знаходзіцца за 15 км. ад г. Глыбокае Віцебскай вобласці ў паўночна-заходнім напрамку. Большасць жыхароў вызнае каталіцтва. Штогод на «Зялёныя свёнткі» (Спасланне Духа Святога на апосталаў, рухомае свята) жыхары дадзенай вёскі здзяйсняюць абыдзённы абрад, які і будзе разгледжаны намі ніжэй. У аснову даследавання пакладзеныя этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя 20 кастрычніка 2012 г. падчас аднадзённай экспедыцыі [4].

Абрад «Насіць намётку» жыхароў в. Папшычы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці з’яўляецца мадыфікацыяй старажытнага абыдзённага абраду. Штогод на свята Спаслання Духа Святога на апосталаў па календары каталіцкай канфесіі жыхары вёскі збіраюцца для здзяйснення абраду. Ён распачынаецца ля прыдарожнага крыжа адмысловым спевам («Królu nieba wysokiego»), пасля чаго разгортваецца адрэз палатна – намётка. На намётку кладуць грашовую ахвяру, якая пасля ідзе на патрэбы парафіяльнага касцёла. Намётку праносяць над маленькімі дзецьмі і іх бацькамі, што павінна паўплываць на іх здароўе і дабрабыт. Працэсія з разгорнутай намёткай (даўжыня тканіны прыкладна 6 м.) накіроўваецца на могілкі. Там адбываецца асвячэнне намёткі і яе ахвяраванне касцёлу [3, с. 389].

Жыхары в. Папшычы для абазначэння абыдзённай тканіны адзінадушна ўжываюць назву «намётка». Гэтая характэрная асаблівасць для Дзісеншчыны была зафіксавана яшчэ этнографамі ў XIX ст. [1, с. 264].

У Папшычах было выяўлена некалькі варыянтаў тлумачэння прычын правядзення абыдзённага абраду, але пераважаюць дзве. Першая – гэта масавая смерць людзей ад хваробы: «*ад балезні, ад пажараў*» [4, л. 13]. Другая – частыя пажары ў вёсцы: «*Гарэлі Папшычы. Сільна гарэлі хаты. І тады рашылі яны, што каб спасці, за адзін дзень яны там ткалі гэту намётку. І тады гэтак во яны начали*» [4, л. 9]. Нягледзячы на разыходжанні ў варыянтах першапрычыны здзяйснення абраду, усе інфарманты зыходзяцца ў тым, што існаванню вясковай супольнасці пагражала значная небяспека: «*Нешта было нейкае. Няшчасце нейкае было. За гэта і насілі, сталі насіць гэту [намётку], хадзіць*» [4, л. 7]. І яшчэ: «*Ну нейкая была ж там нешта. Ці там пажары, ці хвароба была. Гэта ж бабуля расказвала, што крэпка людзі ўмiралі там. Пашці кажны дзень па нескальку чалавек хавалі. Ну і тады гэта рабілі. Хто казаў, што вродзе бы вёска гарэла тожа. І людзі рашылі гэткую афяру. Хто ім пасаветаваў ці яны самі…*» [4, л. 16]. Падобныя прычыны першазвароту да абыдзённага абраду даволі распаўсюджанымі і выяўляліся ў іншых месцах [2, с. 4]. Значную ж цікавасць уяўляе сведчанне Марыі Францаўны Кушнярэвіч, 1941 г.н.: «*Нашто носяць, гэтак нашыя бацькі казалі. Ну, гэта яшчэ не знаю, да вайны, ці гэта… Страшная хвароба была – халера. Усіх людзей сплош радам. Ну, што рабіць? Ужо тут блізка і гэта… Сабралася вёска. За ноч выткалі палатно. Ну, якое там што ў каго было знялі там і выткалі. І што рабіць? Ля вёскі была дарога вакруг даўней, круга вёскі хадзілі. Ну сабраліся ўсе і пашлі гэтай [дарогай]. І ружанец і малітвы і пашлі круга вёскі ўжо прасіць Бога, каб абараніў ад гэтай халеры. І праз нескалька, ну, і цішына. Ніякія ўжо [не ўмiралі]. У Зялезьках умiралі, там радам гэтыя. Умiралі, умiралі. Тады некаму тут са старых саснілася, гэта, хвароба. Кажыць: «Чаго ты прычапілася?! (Ну, дзе ўмiралі) Ідзі ў Папшычы!» (Што тут ніхто не ўміраіць). Кажыць: «Не пайду. Там рыжы сабака круга вёскі лётаіць». Ну і ніхто не памёр*» [4, л. 4].

Практыка здзяйснення абраду не перапынялася, а мясцовая супольнасць была зацікаўленая ў яго захаванні і перадачы наступным пакаленням.

Узяўшы пад увагу ўнікальнасць абраду ды жаданне мясцовай супольнасці захаваць дадзены элемент нематэрыльнай культурнай спадчыны, аўтарам артыкула была распачата справа па ўключэнні дадзенага абраду ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Пасля фіксацыі і вывучэння абраду пачалася праца па падрыхтоўцы пакета дакументаў. Сярод іх – намінацыйная форма, афіцыйны ліст ад мясцовай улады, у якім пазначаюцца адносіны да ўключэння элемента ў Дзяржаўны спіс і абавязкі па захаванні элемента; пацвярджэнне згоды супольнасці на ўключэнне элемента ў Дзяржаўны спіс; экспертнае заключэнне; ліст аб перадачы аўтарскіх правоў на фотаздымкі і відэа; запісы інтэрв’ю носьбітаў (прадстаўнікоў розных пакаленняў), у якіх выяўляецца іх жаданне захоўваць і развіваць элемент (можа быць часткай фільма); карта рэгіёна з пазначэннем арэала распаўсюджвання элемента; публікацыі, выданні.

Два эксперты (Т. В. Валодзіна і Т. І. Кухаронак) прысутнічалі на правядзенні абраду ў 2013 г. На падставе назiранняў і сабраных імі матэрыялаў былі зроблены экспертныя заключэнні.

Пасля ўвесь пакет дакументаў быў накіраваны ў Інстытут культуры Беларусі для праверкі і дапрацоўкі.

Пасяджэнне Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь адбылося 22 студзеня 2014 г. Рашэннем членаў Рады была аднагалосна падтрымана прапанова аб наданні статусу нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь дзевяці элементам нематэрыяльнай культуры, а сярод іх і абраду «Насіць намётку».

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Уключэнне ўнікальнага абраду ў Дзяржаўны спіс прадугледжвае цэлы шэраг мер па яго захаванні:

- правядзенне ўсебаковага грунтоўнага вывучэння, даследавання абраду (да 2015 г., адказны – ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці»);
- выданне кнігі і мультымедыйных матэрыялаў, прысвечаных абыдзённаму абраду жыхароў вёскі (пачынаючы з 2014 г., адказны – Аддзел культуры Глыбоцкага райвыканкама);
- стварэнне відэафільма пра дадзены абрад (2014 г., адказны – Аддзел культуры Глыбоцкага райвыканкама);
- метадычная распрацоўка ўрока па краязнаўстве ў рэгіёне, які б знаёміў з усімі элементамі НКС, што знаходзяцца на тэрыторыі Глыбоцкага раёна і ўнесены ў Дзяржаўны спіс (пачынаючы з 2014 г., адказны – Глыбоцкі райвыканкам);
- вядзенне пастаяннага маніторынгу абраду з удзелам навукоўцаў у галіне фалькларыстыкі (пачынаючы з 2014 г., адказны – Аддзел культуры Глыбоцкага райвыканкама).

Акрамя таго, уключэнне абраду «Насіць намётку» ў Дзяржаўны спіс спрыяла павышэнню цікавасці да абраду як саміх носьбітаў, так і мясцовых ды рэспубліканскіх СМІ.

Значная ўвага да мясцовай супольнасці з боку даследчыкаў і журналістаў спрыяла абуджэнню цікавасці да абраду ў жыхароў вёскі, што выявілася ў колькасным росце ўдзельнікаў абраду «Насіць намётку» ў 2013 г. Праца па ўключэнні абраду ў Дзяржаўны спіс спрыяла яго ўсебаковаму вывучэнню і фіксацыі. Усё гэта дазваляе меркаваць, што дадзены аб'ект нематэрыяльнай культурнай спадчыны стаў больш жыццяздольным, а частка фактараў, што пагражалі яго існаванню, была ліквідаваная.

**Спіс літаратуры:**


1. Дмитриев, М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-западного края / М. А. Дмитриев. – Вильна, 1869. – 265 с.
2. Лобачевская, О. А. Обыденное полотенце: материалы к реконструкции ритуала и его трансформации в Беларуси (первая половина XX в.) / О. А. Лобачевская // Традиционная культура : научный альманах. – 2005. – № 3. – С. 13–22.
3. Філіпчык, Д. Асаблівасці абыдзённага абраду ў вёсцы Папшычы Глыбоцкага раёна / Д. Філіпчык // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстык . – Мінск : Права і эканоміка, 2013. – Вып. 15. – С. 389–396.
4. Этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя 20 кастрычніка 2012 г. у в. Папшычы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці // Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. – Фонд 13. – Воп. 2. – Спр. 14. – Л. 20.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ